# ЖАНРАВЫЯ РАЗНАВІДНАСЦІ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ (ПАВОДЛЕ ТВОРЧАСЦІ М. ТАНКА)

**М. В. Чэкун**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*marinachekun@mail.ru;*
*навук. кір. – В. П. Рагойша, д-р філал. навук, праф.*

У артыкуле ўпершыню разглядаюцца тры жанравыя разнавіднасці інтымнай лірыкі. У сувязі з тым, што інтымная лірыка звычайна разумеецца як сукупнасць вершаў, прысвечаных каханню, з’явілася неабходнасць больш грунтоўна даследаваць яе з мэтай удасканалення самога гэтага паняцця. Звернута ўвага яшчэ на дзве разнавіднасці інтымнай лірыкі на аснове творчасці Максіма Танка і прыведзены падзел жанравай сістэмы на тры падсістэмы: вершы пра маці і сямейныя ўзаемаадносіны, вершы пра дружбу і сяброў, вершы пра каханне. Кожная з іх апісана, прааналізавана і падмацавана прыкладамі. Артыкул дапамагае вызначыць новыя межы інтымнай лірыкі і пашырыць уяўленні пра гэты жанр. Праца можа быць карыснай пры далейшым даследаванні аб’екта, а таксама пры вывучэнні творчасці Максіма Танка.

***Ключавыя словы:*** інтымная лірыка; жанр; жанравыя разнавіднасці; вершы пра маці; вершы пра сяброўства; вершы пра каханне.

Перш за ўсё трэба акрэсліць, што такое жанр і якое месца займае інтымная лірыка ў гэтым паняцці. В. П. Рагойша, у прыватнасці, вызначае жанр як «гістарычна акрэслены, адносна ўстойлівы тып мастацкай формы, дзе структура пэўных фармальных прыкмет выяўляе больш-менш канкрэтны паэтычны сэнс» [3, с. 123]. Зыходзячы з гэтага азначэння, можна сцвярджаць, што пры выдзяленні жанру патрэбна ўлічваць не толькі форму, але і змест, які можа стаць нават асноўным пры аднясенні твора да таго ці іншага жанру. Асабліва выразна гэта праяўляецца ў лірыцы, у якой зместавая прыкмета часта кладзецца ў аснову жанравага падзелу. Паводле гэтага лірыка падзяляецца на жанры, сярод якіх існуе інтымная лірыка. Яе можна нават назваць жанравай сістэмай. Аднак на гэтым класіфікацыя не спыняецца. У кожнай жанравай сістэмы ёсць свае разнавіднасці паводле таго ж зместавага крытэрыю. Калі ўзяць, напрыклад, пейзажны верш, то праз апісанне прыроды могуць перадавацца пэўныя філасофскія або грамадзянскія думкі, і гэта таксама трэба ўлічыць, каб размежаваць іх пэўным чынам. Такім чынам, і ў інтымнай лірыцы існуюць свае жанравыя разнавіднасці.

Што сабой уяўляе інтымная лірыка ўвогуле? Разгледзім кожнае слова гэтага тэрміна паасобку. Агульнавядома, што лірыка – гэта «мастацтва суб’ектыўнае, прадмет якога – пачуццё» [2, с. 167]. Інтымны – значыць глыбока асабісты, сардэчны, шчыры. Тры гэтыя словы характарызуюць

пачуццё, якое не ведае межаў, якое з'яўляецца крыніцай усіх астатніх пачуццяў. Найперш – гэта любоў да маці і сям'і. Маці і сям'я – гэта падмурак нашага жыцця і светаўспрымання, нашых думак і мар. Яшчэ з ранняга дзяцінства не абыходзімся мы і без шчырага сябра, які падтрымае нас у цяжкую хвіліну. Таму другой жанравай разнавіднасцю інтымнай лірыкі з'яўляюцца вершы пра дружбу і сяброў. І, канешне ж, як без кахання, якое, дарэчы, храналагічна прыходзіць да чалавека пазней, чым любоў да маці і сяброў.

Не абмінуў усе гэтыя тэмы, а значыць, і гэтыя жанравыя разнавіднасці інтымнай лірыкі і М. Танк. Для паэта дадзеныя тры словы былі не проста словамі, а натхняльнікамі стварэння вялікай колькасці твораў.

У яго вершах ёсць шмат разважанняў пра сяброў, каханне і маці. І амаль у кожным з іх першае месца заслужана займае маці.

Вельмі ўражвае верш «Помню: маці заўсёды клалася спаць…» [4, с. 305]. Гэта той самы твор, які проста вымушае задумацца над сваім стаўленнем да матулі, да яе працы, пераасэнсаваць свае погляды. Маці – гэта, сапраўды, той чалавек, які робіць вельмі шмат, больш за ўсіх астатніх, яна нават, як піша паэт, кладзецца спаць апошняй.

М. Танк асаблівую ўвагу надаваў рукам маці. У вершы «Не знаю» ён нават параўноўвае іх з зоркай, на якой дакладна ёсць жыццё, і гэтае жыццё стварыла яна:

Не знаю,
Ці ёсць жыццё
на нейкіх зорках.
Я знаў толькі адну зорку –
Пяцікрылую далонь маці,
На якой выраслі
Мы, наш хлеб, нашы песні.
Святло якой
Вечна струменіць [4, с. 302].

Апошнія словы з'яўляюцца пацвярджэннем таго, што матчына святло будзе вечным, яно будзе заўсёды, як зорка, вызначаць наш далейшы жыццёвы шлях.

Ёсць у паэта верш з назвай «Рукі маці». Рукі маці – гэта карціна ўсяго яе жыццёвага шляху. Маці ніколі не выказвала свайго гора, каб не засмуціць нас, ніколі не паказвала сваёй стомленасці. Рукі маці дакраналіся да нашага твару, каб супакоіць і выцерці слёзы, назаўсёды пакідалі цеплыню на нашых шчоках.

Толькі заўсёды,
Як мы зберымося дамоў
І на стол пакладзе рукі маці,
Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце

І ў сэрцы [4, с. 89].

Маці і сям'я спадарожнічалі М. Танку цягам усяго яго нялёгкага шляху. Матуля для яго – крыніца чуласці, дабрыні, цеплыні і спагады. Гэта той чалавек, які, як пісаў паэт, «чулай, шорсткай далоняй здымае з мяне стому, цяжар пражытых гадоў» [5, с. 801]. Маці – «самы святы і нерукатворны вобраз» [5, с. 801].

Але перад дружбакамі,
Перад шчырымі сябрамі,
Перад сонцам, што нам свеціць,
Хай адкрыта будзе сэрца! [4, с. 285].

Менавіта так заканчваецца верш Максіма Танка «Не давайце таму хлеба…». Гэтымі радкамі можна пачаць размову пра сяброўства ў творчасці выдатнага паэта. Тут пісьменнік адразу акрэсліў месца сапраўдных, шчырых сяброў – яны ў яго сэрцы. Доказам гэтаму служаць іншыя вершы пра сяброўства.

Адным з твораў інтымнай лірыкі пра дружбу з'яўляецца верш «Адказ на пісьмо друга» [5, с. 367]. Ён прысвечаны Камілю Ежы Вайнтраўбу – польскаму паэту, публіцысту і перакладчыку. Верш прасякнуты пачуццём жалю з той прычыны, што паэт ведае пра сваё спазненне з адказам на ліст сябра: той, на жаль, памёр. Адказ паэта не будзе прачытаны адрасатам. Першыя радкі твора ствараюць нейкую бязвыхаднасць, аднак далей вера ў лепшае, вера ў свайго сябра нарастае. Успамінаюцца любімыя месцы сябра, яго звыклыя дзеянні – усё гэта дае магчымасці чытачу прасачыць, з якой уважлівасцю ставіўся аўтар да свайго сябра, які застаўся жыць у яго сэрцы, куды і быў адрасаваны адказ.

Яшчэ адным прадстаўніком інтымнай лірыкі пра сяброўства з'яўляецца верш «Партрэт друга» [5, с. 375]. Калі супаставіць гэтыя два вершы, то ствараецца такое ўражанне, што паэт быццам зрабіў нейкі глыбокі для сябе вывад пасля страты сябра і немагчымасці паглядзець на яго ў апошні раз. Верш таксама напоўнены хваляваннямі. Аўтар з такім замілаваннем апісвае свайго сябра, што, здаецца, у яго гэта атрымліваецца лепш, чым у якога-небудзь мастака.

Вершы пра каханне займаюць значную частку ў творчасці паэта. У М. Танка была адзіная жонка – Любоў Андрэеўна. Яны пражылі разам усё жыццё, нават нарадзіліся і памерлі ў адзін год. Гэта было чыстае і светлае пачуццё, яны не маглі жыць адзін без аднаго. Каханне было другім крылом паэта, якое, разам з імкненнем да свабоды, уздымала яго, нібы птушку, увысь, да сонца:

А ты пытаешся, ці мог бы
Жыць без кахання, без цябе.
Спытайся птушкі, ці змагла б
Яна ўздымацца без крыла [4, с. 1].

Вялікая колькасць вершаў паэта апісвае прыгажосць жанчыны. У вершы «Нашто ты косы заплятаеш» [4, с. 17] аўтар настолькі ўражаны хараством дзяўчыны, што ўпэўнены: яна не зможа ўбачыць сябе сапраўдную з дапамогай звычайнага люстэрка, Гэта можа перадаць толькі старонні чалавек, які адчуе ўсё, што бачыць.

Яшчэ адзін прыклад інтымнай лірыкі – верш «Завушніцы». Гэты твор напоўнены чуласцю і цеплынёй, а таксама верай у тое, што каханне трэба падчас і здабыць. Ён сведчыць і пра веру ў лекавую моц кахання ў цяжкія хвіліны жыцця, у падтрымку на перапетыях лёсу:

Сягоння не ўцячэ ўжо
Ад слоў маіх гарачых
Ні ў час, калі смяецца,
Спявае або плача.
Ні ў час, калі прыляжа,
Змарыўшыся, змярканнем, –
Звіняць ёй завушніцы
Усё пра маё каханне [4, с. 27].

Увогуле, стаўленне М. Танка да жанчыны ўнікальнае. Ён не проста апісвае сваю каханую або маці, як сапраўдную гераіню, прыгажуню, а лічыць усіх жанчын той самай сутнасцю, без якой немагчыма жыццё, без якой «сонца зусім не грэе, вада – не ўталяе смагі, хлеб – горкі, птушкі – безгалосыя, травы – чэрствыя, кветкі – недухмяныя, дні – сумныя, ночы – бяссонныя» [4, с. 71].

Такім чынам, інтымная лірыка (і пра гэта выдатна сведчыць творчасць М. Танка) мае не адзін накірунак і апісвае не толькі каханне. Гэта ўнікальная жанравая сістэма, якая вельмі шырока ахоплівае духоўны свет аўтара, яго пачуцці і перажыванні, яго ўласныя думкі і мары: пра сям'ю, сяброўства і каханне.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Поспелов Г. Н.* Лирика: Среди литературных родов. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976.
2. *Рагойша В. П., Кенька М. П., Марозава Т. А.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: вучэб. дапаможнік: у 2 ч. Ч. 1: Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / пад. рэд. В. П. Рагойшы. Мінск: БДУ, 2011.
3. *Рагойша В. П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мінск: Бел. Энцыкл., 2001.
4. *Танк М.* Мне пару крыл дало юнацтва…: выбр. лірыка / уклад. В. П. Рагойшы. Мінск: Маст. літ., 2003.
5. *Танк М.* Збор твораў / прадм. М. Мікуліча. Мінск: Харвест, 2010.